Раз каласок, два каласок...

Агітацыйныя плакаты сельскагаспадарчых кампаній

Каб растлумачыць сучасным маладым людзям, што такое савецкі агітацыйны плакат, без апелявання да паняцця «рэклама» наўрад ці абыдзешся. І ўсё роўна параўнанне гэта будзе недакладным. Хіба што бліжэй да разумення вобраза плаката цяперашняя сацыяльная рэклама. Але і яна далёкая ад выканання той ролі, якая належала плакату ў СССР, а менавіта – быць сродкам агітацыі і прапаганды, «уздзейнічаць на свядомасць і настрой людзей у мэтах стымулявання іх да палітычнай або іншай дзейнасці».

Мастацтва плаката было даступна шырокім масам, таму што грунтавалася на зразумелых кожнаму вобразах. Добра запамінаўся і кароткі тэкст, які суправаджаў выяву або малюнак. Часцей за ўсё гэта быў заклік да дзеяння, але магло быць і павучанне або перасцярога. Агітацыйны плакат у СССР можна было сустрэць усюды. У рэспубліках – часцей на нацыянальных мовах. Плакатамі мастакі адгукаліся на ўсе значныя падзеі ў жыцці савецкага народа. Была запатрабавана плакатная агітацыя і ў час маштабных будоўляў, у ходзе выбарчых і сельскагаспадарчых кампаній. Ва ўборку, напрыклад, плакаты маглі наглядна вучыць тэхніцы бяспекі, заклікаць беражліва ставіцца да кожнага каласка, прапагандаваць вопыт перадавікоў...